*СЁННЯ Ў НУМАРЫ:*

ЗАПАВЕТАМ ЛЕНІНА ВЕРНЫЯ ● НОВАЯ ВЫСТАЎКА КНІГ ● ДА ДНЯ АБВЯШЧЭННЯ ГДР: ФОТАРЭПАРТАЖ З АДКРЫЦЦЯ ТЫДНЯ САВЕЦКА-ГЕРМАНСКАЙ ДРУЖБЫ ● КАМІТЭТ КАМСАМОЛА ПАСТАНАВІЎ... ● З НАШАЙ ПОШТЫ ● АБ ТЫХ, КАМУ БДУ ДАЎ ПУЦЁЎКУ Ў ЖЫЦЦЁ ● БЫЦЬ ЦІ ЗДАВАЦЦА? ● ФОТААКНО ПАДАРОЖНІКА.

## ПА БДУ
### ІНФАРМАЦЫЯ

**У новым навучальным годзе на механіка-матэматычным факультэце працягвае работу семінар «Алгебра і тапалогія» пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР У. П. Платонава. На чарговых занятках У. П. Платонаў выступіў з лекцыяй «Сучасныя праблемы матэматыкі».**

* * *

На геаграфічным факультэце адбыўся тэарэтычны семінар выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта з парадкам дня: «Важнейшыя праблемы развіцця сельскай гаспадаркі СССР у святле рашэнняў ліпеньскага Пленума ЦК КПСС». Дакладчыкі: дацэнт кафедры эканамічнай геаграфіі СССР Н. І. Жураўская і дацэнт кафедры глебазнаўства і геалогіі В. С. Аношка.

* * *

**Першая лекцыя цыклу «Майстры заходнееўрапейскага жывапісу», якi арганізавала Мінскае гарадское таварыства «Веды», праведзена ў БДУ. Пра жыццё і творчы шлях французскіх мастакоў Давіда і Энгра расказала супрацоўніца Эрмітажа В. Н. Бярэзіна.**

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСНАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 29 (1216) ● 12 кастрычніка 1978 г. Цана 2 кап.

Да 60-годдзя БССР і КПБ

## АБ ТАБЕ, БЕЛАРУСЬ

«У сям'і адзінай, брацкай» — так называецца адна з кніжных выставак, якія дэманструюцца зараз ва універсітэцкай бібліятэцы.

Акрамя матэрыялаў з'ездаў КПСС і КПБ тут прадстаўлена некалькі гістарычных манаграфій: «Гісторыя Беларускай ССР», «Нарысы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі», «Барацьба за Савецкую ўладу ў Беларусі» і даследаванні асобных, у тым ліку — нашых, універсітэцкіх аўтараў: В. Г. Гняўко «Рабочы клас у барацьбе за перамогу Кастрычніка», І. В. Царук «У братнім саюзе» (сацыялістычныя пераўтварэнні эканомікі ў заходніх абласцях БССР. Верасень 1939 — чэрвень 1941).

Звяртае на сябе ўвагу невялічкі томік з назвай «У памяці народнай» — пуцевадзіцель па месцах барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады ў Беларусі, за гонар, свабоду і незалежнасць сацыялістычнай радзімы.

Асобна трэба адзначыць кнігі аб камсамольцах і моладзі нашай рэспублікі, кнігі, якія расказваюць аб унутрысаюзным і міжнародным становішчы БССР. Сярод іх вылучаюцца: «Беларуская ССР — адна з заснавальніц Саюза ССР» М. Я. Шкляра і невялікі зборнік «Міжнародныя сяброўскія сувязі Беларусі».

Упрыгожваюць выстаўку фотаальбомы: «Беларусь», «Сказ пра Палессе», «Беларусь Савецкая» і маляўніча аформленыя асобныя выданні, якія прадстаўляюць кожную з абласцей БССР.

Пра сталіцу нашай рэспублікі і яе жыхароў апавядае кніга былога выпускніка факультэта журналістыкі БДУ, журналіста А. Кудраўцава «Мінск і мінчане».

Апошні раздзел выстаўкі знаёміць з прамысловасцю і сельскай гаспадаркай Беларусі.

**Т. АЛЯКСАНДРАВА.**

# Запаветам Леніна верныя

**Бюро ЦК ВЛКСМ прыняло пастанову «Аб Усесаюзным камсамольскім сходзе «Запаветам Леніна верныя», прысвечаным 60-годдзю ВЛКСМ, які пройдзе з 18 па 25 кастрычніка 1978 года ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях краіны (у камсамольскіх арганізацыях універсітэта сходы пройдуць з 12 па 22 кастрычніка).**

Усесаюзны камсамольскі сход праводзіцца ў адпаведнасці з рашэннем XVIII з'езда ВЛКСМ. У пастанове падкрэсліваецца, што камітэты камсамола павінны выкарыстоўваць падрыхтоўку і правядзенне Усесаюзнага камсамольскага сходу для прапаганды слаўнай гісторыі Ленінскага камсамола, дзейнасць якога ўсе гэтыя гады клапатліва накіроўвае Камуністычная партыя, для ўмацавання камуністычнага выхавання моладзі, развіцця яе працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці, для далейшага арганізацыйна-палітычнага ўмацавання ВЛКСМ.

Усесаюзны камсамольскі сход павінен стаць калектыўнай справаздачай камсамольскіх арганізацый, камсамольцаў і моладзі перад партыяй і народам аб выкананні ленінскага запавету «Вучыцца камунізму», рапартам аб поспехах у працы, вучобе, воінскай службе ў гонар юбілею камсамола.

Прааналізаваць удзел кожнай камсамольскай арганізацыі, юнакоў і дзяўчат ва ўсенароднай барацьбе за ператварэнне ў жыццё гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, у рэалізацыі задач, пастаўленых у Прывітанні ЦК КПСС XVIII з'езду ВЛКСМ, прамовы на ім Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева, рашэнняў XVIII з'езда ВЛКСМ. Бюро ЦК ВЛКСМ рэкамендуе падвесці вынікі Усесаюзнай ударнай вахты ў гонар 60-годдзя ВЛКСМ, адзначыць пераможцаў, намеціць меры па паспяховаму завяршэнню планаў і абавязацельстваў трэцяга года дзесятай пяцігодкі, актыўнаму ўдзелу камсамольскіх арганізацый у рэалізацыі эканамічнай стратэгіі партыі.

Падрыхтоўку і правядзенне сходаў шырока выкарыстоўваць для далейшага ўзмацнення выхаваўчай работы камсамольскіх арганізацый на прыкладзе жыцця і дзейнасці У. І. Леніна, рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях Камуністычнай партыі, савецкага народа, Ленінскага камсамола.

Абмеркаваць дзейнасць камсамольскіх арганізацый па ідэйна-палітычнаму, працоўнаму і маральнаму выхаванню юнакоў і дзяўчат, усебаковаму і гарманічнаму развіццю кожнага маладога чалавека.

Усесаюзны камсамольскі сход, гаворыцца ў пастанове, павінен садзейнічаць далейшаму арганізацыйна-палітычнаму замацаванню пярвічных, цэхавых арганізацый, камсамольскіх груп, удасканаленню форм і метадаў іх дзейнасці, развіццю крытыкі і самакрытыкі, творчай ініцыятывы і актыўнасці камсамольцаў і моладзі.

Бюро ЦК ВЛКСМ абавязала камітэты камсамола забяспечыць правядзенне Усесаюзнага камсамольскага сходу на высокім арганізацыйным і палітычным узроўні, не дапускаць праяў параднасці і шуміхі.

Сход рэкамендуецца праводзіць у нерабочы час, адкрытым, масавым, з шырокім прыцягненнем несаюзнай моладзі, запрашэннем ветэранаў партыі і камсамола, прадстаўнікоў усіх камсамольскіх пакаленняў, герояў і перадавікоў працы, настаўнікаў моладзі. Асаблівую значымасць сходу надасць удзел у ім партыйных і савецкіх работнікаў, гаспадарчых кіраўнікоў, дэлегатаў XXV з'езда КПСС, XVIII з'езда ВЛКСМ, урачысты прыём у рады ВЛКСМ лепшых маладых рабочых, калгаснікаў, воінаў, навучэнцаў.

Усесаюзнаму камсамольскаму сходу павінны папярэднічаць грамадска-палітычныя чытанні, прысвечаныя 60-годдзю ВЛКСМ, сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі, партыі, Ленінскага камсамола, лекторыі, прагляды кінахронікі, вечары працоўнай славы, рабочых дынастый і пакаленняў.

Бюро ЦК ВЛКСМ звярнула ўвагу на прапагандысцкае забеспячэнне сходу. У гэтых мэтах шырока выкарыстоўваць магчымасці сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды, нагляднай агітацыі. У камсамольскіх арганізацыях аформіць стэнды, фотавыстаўкі, тэматычныя экспазіцыі па гісторыі ВЛКСМ, сваіх арганізацый, аб ролі моладзі ў справах калектыву.

Камітэтам камсамола разгледзець пытанні падрыхтоўкі да сходу, распрацаваць графікі яго правядзення, уважліва і своечасова прааналізаваць крытычныя заўвагі, прапановы ўдзельнікаў сходаў, прыняць меры да іх выканання.

Камітэт камсамола БДУ імя У. І. Леніна выказвае ўпэўненасць у тым, што Усесаюзны камсамольскі сход стане дзелавой і канкрэтнай размовай у кожнай камсамольскай арганізацыі, будзе садзейнічаць павышэнню вучэбнай і грамадска-палітычнай актыўнасці кожнага юнака і дзяўчыны, прадэманструе гатоўнасць маладога пакалення да новых подзвігаў у імя Радзімы.

## 7 КАСТРЫЧНІКА—29 ГАДАВІНА АБВЯШЧЭННЯ ГДР

**7 кастрычніка ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначыла 29-ю гадавіну ўтварэння ГДР.**

**У БДУ навучаецца шмат нямецкіх юнакоў і дзяўчат, для якіх створаны самыя спрыяльныя ўмовы для паспяховай вучобы і добрага адпачынку.**

**На філалагічным факультэце 6 кастрычніка адбылося ўрачыстае адкрыццё тыдня савецка-германскай дружбы. У праграме тыдня — вечар сучаснай нямецкай музыкі, сустрэча з удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны дацэнтам філалагічнага факультэта Ларысай Лявонцьеўнай Кароткай, вечар адпачынку.**

**(Фотарэпартаж з адкрыцця тыдня савецка-германскай дружбы ў БДУ глядзіце на 2—3 старонках.)**

(Фотарэпартаж з адкрыцця тыдня савецка-германскай дружбы ў БДУ глядзіце на 2—3 старонках.)



**На здымку: Генеральны сакратар Цэнтральнага камітэта Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі, Старшыня Дзяржаўнага савета ГДР Эрых Хонекер сярод членаў Таварыства савецка-германскай дружбы.**

## Пісьмо ў нумар

Студэнты універсітэта Аляксандр Казулін, Галіна Гулькові ч, Сяргей Калмыкаў, Марына Нікульшына, Аркадзь Ненартовіч, Аляксандр Пушэнка, Юрый Пазняк, Сяргей Чыжык, Таццяна Якавец працавалі на будаўніцтве мемарыяла Герою Савецкага Саюза Аляксандру Матросаву ў в. Чарнушкі, Лакнянскага раёна, Пскоўскай вобласці.

Гэта патрыятычнае пачынанне ў гонар 60-годдзя ВЛКСМ узвялічвае славу Ленінскага камсамола, сведчыць аб пераймальнасці традыцый пакаленнямі савецкай моладзі.

Мы з задавальненнем паведамляем, што выхаванцы універсітэта з гонарам справіліся з адказным заданнем, з'явіліся лепшым прыкладам працавітасці і высокай свядомасці.

Праяўляючы настойлівасць, упарта пераадольваючы цяжкасці, яны зрабілі ўсё магчымае, каб мемарыял быў адкрыт да юбілею камсамола.

Занальны штаб вельмі ўдзячны калектыву універсітэта за выхаванне патрыётаў, горача адданых камуністычным ідэалам. Яны замацоўваюць рады Ленінскага камсамола, аўтарытэт ВНУ і будуць дастойнымі арганізатарамі вытворчасці.

**Камандзір Новаржэўскага імя Кастрычніцкай рэвалюцыі занальнага атрада А. СЛУКА.**
**Камісар В. ЛЕВАШЭВІЧ.**

# Пастанова

## БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА «АБ СВЯТКАВАННІ 60-ГОДДЗЯ ВЛКСМ»

**У абстаноўцы вялізнага палітычнага і працоўнага ўздыму сустракае савецкая моладзь 60-годдзе Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі. Ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях краіны ў гэтыя дні праходзяць ударныя вахты ў гонар юбілею, падводзяцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва маладых працаўнікоў.**

**Натхнёнай працай і высокай грамадска-палітычнай актыўнасцю была адзначана ў юбілейным годзе дзейнасць адзінаццацітысячнай камсамольскай арганізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У студэнцкіх аўдыторыях і навукова-даследчых лабараторыях, на будоўлях трэцяга працоўнага семестра і восеньскіх сельскагаспадарчых работах — усюды камсамольцы універсітэта былі ўзорам працавітасці і энтузіязму.**

**Напярэдадні слаўнага юбілею бюро камітэта камсамола пастанаўляе:**

**1. Усім камсамольскім арганізацыям універсітэта, кожнаму члену ВЛКСМ прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і святкаванні 60-годдзя Ленінскага Саюза Моладзі, азнаменаваць юбілей камсамола выдатнай вучобай, поспехамі ў навукова-даследчай рабоце.**

**2. Камітэтам ЛКСМБ факультэтаў да 18 кастрычніка падвесці вынікі сацыялістычнага спаборніцтва сярод камсамольцаў за права падпісаць Рапарт Цэнтральнаму Камітэту ВЛКСМ да 60-годдзя камсамола. Падпісанне Рапарта правесці ва ўрачыстай абстаноўцы, з запрашэннем ветэранаў партыі і камсамола, дэлегатаў камсамольскіх з'ездаў.**

**3. У адпаведнасці з пастановай Бюро ЦК ВЛКСМ ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях акадэмічных груп у перыяд з 12 па 22 кастрычніка правесці Усесаюзны камсамольскі сход «Запаветам Леніна верныя», на якім прааналізаваць вынікі работы ў юбілейным годзе, абмеркаваць выкананне асабістых комплексных планаў удзельнікаў Ленінскага заліку, намеціць планы і задачы на чарговы год.**

**4. Камітэтам камсамола факультэтаў з 16 па 29 кастрычніка правесці Усесаюзную камсамольскую паверку «Раўненне на герояў камсамола», у плане якой прадугледзець правядзенне тыдня рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы Ленінскага камсамола, сустрэчы з ветэранамі ВЛКСМ, урачыстыя пасяджэнні, вечары адпачынку і агеньчыкі, ускладанне кветак да помнікаў і абеліскаў, сумесныя мерапрыемствы з падшэфнымі арганізацыямі і воінскімі часцямі.**

**5. Правесці ўрачысты пленум камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна і вечар, прысвечаны юбілею камсамола.**

**6. Прэс-цэнтру камітэта камсамола універсітэта сумесна з рэдакцыяй шматтыражнай газеты «Беларускі універсітэт» падрыхтаваць спецнумар, прысвечаны 60-годдзю ВЛКСМ.**

**7. Кантроль за выкананнем пастановы ўскласці на ідэалагічны аддзел камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна.**

# Кожны двaіх стоіць...




Дарога з Рамашкова — цэнтральнай сядзібы калгаса «XXI партз'езд» вядзе ў вёску Замошша. Зямля перамешана коламі цяжкагружаных машын. Свежаўспаханыя палі здаваліся наскрозь прамокшымі. Зрэшты, «здаваліся» тут ні пры чым, так яно і было. Але, нягледзячы на непагадзь, студэнтаў-першакурснікаў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна я застаў за работай. Дзяўчаты падымалі лён, а хлопцы ссыпалі ў бурты бульбу. Працавалі дружна, спяшаліся да цемнаты зрабіць паболей.

— Тут мы навучыліся цаніць кожную рабочую хвіліну,— сказаў камісар атрада Васіль Кудраўцаў. — Калі ідзе моцны дождж — абвяшчаем перапынак, сціхне — выходзім на работу.

Своеасаблівым штабам для рабят стала невялікае памяшканне сталовай. Тут яны рэпеціруюць нумары мастацкай самадзейнасці. Нядзельным вечарам у сельскім клубе павінен адбыцца канцэрт з іх удзелам.

Работай студэнтаў у калгасе задаволены.

«Добра працуюць», — так ацаніла сваіх падапечных брыгадзір Валянціна Рыгораўна Шаўня. — У маёй брыгадзе 19 студэнтаў. Кожны дваіх стоіць. Працаваць умеюць і робяць гэта з задавальненнем. Яны ў нас на ўсе рукі майстры. І на сяўбе азімых папрацавалі, і на льняных палях, а цяпер — на ўборцы бульбы.

А ўраджай у гэтым годзе ў калгасе нядрэнны. Гектар дае па 170—180 цэнтнераў. У мінулым жа годзе было ўсяго 107. Вось толькі з надвор'ем не вязе. Пастаянныя дажджы замаруджваюць тэмпы уборкі «другога хлеба». Кожны пагодны час тут стараюцца выкарыстаць для работы.

Увечары рабяты збіраліся ў сталовай, каб падвесці вынікі дня, намеціць планы на заўтра. Тут жа «нарадзіўся» чарговы нумар «Маланкі». Сёння ў ёй значыліся прозвішчы перадавікоў — Аляксандра Лойкі, Віктара Бялоўскага, Наталлі Залыгінай, Алы Ткачовай. І яшчэ ў ёй была лічба — 1200 рублёў. На такую суму атрад выканаў розных сельскагаспадарчых работ.

Аднак студэнт не быў бы студэнтам, калі б не спрачаўся да хрыпаты аб праблемах будовы свету. Таму так доўга гарэла святло ў вокнах маленькага доміка на краі вёскі. Наперадзе ў рабят — шмат залікаў, экзаменаў, гады вучобы, рамантыка будаўнічых атрадаў. Але ўжо зараз можна сказаць, што першы свой экзамен ва універсітэце — працоўны яны трымаюць з гонарам.

**В. ПРЫХОДЗЬКА,**
Талочынскі раён.

# Малайцы, геафакаўцы!

Як мага хутчэй завяршыць усе сельскагаспадарчыя работы імкнуцца працаўнікі саўгаса «Звянчацкі». Немалую дапамогу ім у гэтым аказваюць студэнты другога курса геафака.

За прайшоўшы час, дакладней на 5 кастрычніка, працуючы ў складзе экіпажаў на бульбаўборачных камбайнах, яны ўбралі 188 тон «другога хлеба». 420 тон клубняў сабралі студэнты за капалкамі.

А ў вольны ад работы час рабяты цікава адпачываюць. У мясцовым клубе далі змястоўны канцэрт. Выязджалі з канцэртам мастацкай самадзейнасці ў суседні саўгас «Мілаславіцкі».

Былі праведзены таксама і спартыўныя спаборніцтвы. Так, напрыклад, футбольны матч завяршыўся з лікам 9 : 4 у карысць мінскіх спартсменаў.

**Н. ЛУКАШОВА,**
**загадчыца Звянчацкага сельскага клуба.**

# ШЧЫРАЕ СВЯТА







Шмат віншавальных слоў было выказана ў адрас нямецкіх сяброў на адкрыцці тыдня савецка-германскай дружбы. Выступаўшыя падкрэслілі непарыўную сувязь савецкага і германскага народаў, іх шматгадовае супрацоўніцтва ў эканамічнай, палітычнай і культурнай галінах. Моцная і непарушная дружба звязвае ВЛКСМ і Саюз свабоднай нямецкай моладзі.

— Мы жадаем вам, дарагія сябры, вялікіх поспехаў у пераўтварэнні ў жыццё рашэнняў XVI з'езда ССНМ, у паспяховай пабудове сацыялістычнага грамадства,—сказаў у сваім выступленні член партбюро філфака М. П. Антропаў.

У заключэнне вечара выступіў намеснік дэкана філалагічнага факультэта М. М. Піпчанка. Ён сказаў: «Дарагія нямецкія сябры! Мы вельмі рады, што нам даводзіцца працаваць з вамі, што з году ў год мацнеюць і пашыраюцца ўзаемасувязі паміж нашымі народамі. Мы жадаем вам вялікіх поспехаў у вучобе і ўсяго найлепшага ў жыцці».

У святочным канцэрце прынялі ўдзел савецкія і нямецкія студэнты.

**На здымках:**

**Гучаць рускія песні ў выкананні нямецкіх сяброў.**

**Гарачымі апладысментамі сустракаюць прысутныя кожны нумар мастацкай самадзейнасці.**

**Сцэнкі са спектакля нямецкіх студэнтаў.**

**Фота М. ДУБОВІКА.**

# З ЧАГО СКЛАДАЕЦЦА ПОСПЕХ?

Усякая справа мае свой пачатак. Усякі поспех—тым больш. Вось толькі як вызначыць, дзе ён пачынаецца, дзе дасягае свайго найвышэйшага ўзлёту. Асабліва цяжка гаварыць аб гэтым, калі справа датычыцца вучобы. Тут ніякіх матэрыяльных паказчыкаў, акрамя адзнак у залікоўках, няма. А балы ж яшчэ не ўсё рашаюць. Яны толькі ў спалучэнні з многімі іншымі паказчыкамі гавораць аб сапраўдным становішчы спраў у той ці іншай акадэмічнай групе.

Наша, 2-я група V курса аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта ў гэтым годзе заняла першае месца ў сацспаборніцтве па факультэту. Выпадковасць гэта ці заканамернасць?

Паспрабуем у гэтым разабрацца. Поспех складаецца па крупінках, парой нават вельмі маленькіх, непрыкметных для чужога вока.

Вось стаіць група студэнтаў ля дзвярэй аўдыторыі. Па іх напружаных тварах вы беспамылкова вызначыце—першакурснікі. І як было важна іменна ў гэту самую першую сесію не разгубіцца, не ўпасці ў маркоту ад першай няўдачы. Тут на дапамогу прыйшлі тыя, каму было лягчэй увайсці ў студэнцкае жыццё, у каго былі больш трывалыя запасы ведаў. Валя Зубарэвіч, Ліда Гойнец, Валя Дзямідчык, Валя Яфіменка, Дана Зяньковіч—вось тыя людзі, якім і сёння мы гаворым дзякуй.

Іменна ў гэтыя дні пачалося нараджэнне згуртаванага калектыву. Ішлі дні. Вучоба забірала амаль увесь час. Мастацкую літаратуру даводзілася чытаць, дзе толькі магчыма. І было б намнога цяжэй, калі б не выручалі мы адзін аднаго. Не чытаеш сам—дай таварышу. Гэта дэвіз нашай групы. А калі нешта не ясна? Не бяда. Вось ужо тры гады ў нас у групе працуюць кансультацыйныя пункты.

Асабліва інтэнсіўна даводзіцца працаваць у перыяд сесіі. У час падрыхтоўкі ўзнікае шмат пытанняў. І вось тады збіраюцца студэнты ў адзін з пакояў інтэрната № 4. Не разыходзімся мы да тае пары, пакуль не разбярэм апошняе пытанне. Каб такіх пытанняў было менш, мы стараемся добра рыхтавацца ў перыяд семестра. Трэба адзначыць, што наведваюць нашы студэнты лекцыі і практычныя заняткі добра. У гэтым немалая заслуга нашага старасты Маргарыты Грыб. Мы ўсе ўдзячны ёй. Наперадзе апошняя сесія. Якой яна будзе? У многім гэта залежыць ад сённяшняга дня.

**В. ЗУБАРЭВІЧ.**

